Падтрымай "Вясну" на PATREON

Аляксандр Мех апраўданы ў судзе фота дапоўнена

16.08.2017 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, затрыманні



Аляксандр Мех у судзе 16 жніўня 2017 года.

У Кобрыне супрацоўнікамі мясцовай міліцыі затрыманы грамадскі актывіст **Алесь Мех**. Яго затрымалі а 10-й раніцы 15 жніўня ў кватэры знаёмага **Дзмітрыя Чарніцкага**, які раней дапамагаў Меху на выбарах.

Беларускае Радыё Рацыя паведамляе, што Чарніцкі патэлефанаваў Меху і паведаміў, што некалькі дзён таму яго падманам завезлі ў аддзел і пратрымалі цэлы дзень. Забіралі ключы ад кватэры і вярнулі брудныміі – відаць, рабілі адбітак. Мужчына папрасіў Меха прыехаць, каб праверыць наяўнасць “жучкоў” у кватэры.

> *„Яшчэ Чарнецкі баяўся, каб не падкінулі наркотыкі,”* – кажа Наталля Мех. – *Учора памянялі ключ, памянялі замок у кватэры. А сёння Саша пайшлоў да яго і вось…*

Дзяжурная служба Кобрынскага РАУС пацвердзіла, што Алесь Мех знаходзіцца ў іх, у крымінальным аддзеле.

> *– Супрацоўнікі міліцыі праводзяць праверку. Будзе прынятае законнае рашэнне. Калі Алесь Мех ні ў чым не вінаваты, не парушыў заканадаўства Рэспублікі Беларусь, то абавязкова разбяруцца, адпусцяць і папросяць прабачэння. Рашэнне яшчэ не прынятае, таму я вам пакуль не магу даць ніякай інфармацыі.*

РР: А хто праводзіць праверку? – Супрацоўнікі крымінальной міліцыі.

У кабінеце крымінальнага вышуку сказалі, што выконваючы абавязкі начальнік крымінальнай міліцыі Мікалай Сурма выйшаў. Супрацоўнік, які пажадаў застацца невядомым, даваць інфармацыю пра Алеся Меха адмовіўся.



Сёння Радыё Свабода перадае:

Аляксандар Мех быў затрыманы раніцай 15 жніўня ў Кобрыні разам са сваім сябрам **Дзьмітрыем Чарніцкім** пры выхадзе з дому апошняга:

> *«Мяне вінавацяць у тым, што я нібыта аказаў супраціў супрацоўнікам міліцыі. Затрымлівалі, калі я спускаўся з кватэры свайго сябра — проста ў тамбуры перад дзьвярыма на вуліцу. Дзьверы адчыніліся — і нас пачалі „ламаць". Нічога не казалі, проста заламалі галаву, на падлогу пачалі класьці і рукі закладаць, кайданкі чапляць».*

Як расказаў Аляксандар Мех, затрыманьне адбылося адразу пасьля таго, як ён выявіў праслухоўку ў доме свайго сябра Дзьмітрыя Чарніцкага. Адразу ж, як актывісты выйшлі з кватэры, іх затрымалі.

Учора актывістаў завезьлі ў міліцыю, склалі на іх пратаколы і даставілі ў суд. Дзьмітрыю Чарніцкаму прысудзілі 506 рублёў штрафу (22 базавыя велічыні) за непадпарадкаваньне міліцыянтам і брудную лаянку. Аляксандар Мех запатрабаваў адваката, і яго паседжаньне перанесьлі на 16 жніўня а 15.30.

Адміністратыўная справа ўзбуджаная па арт. 23.34 КаАП.

На судзе ў Аляксандра Меха заўважны сляды ад кайданкоў і сінякі на твары. Выявілася, што ён адмовіўся сесці ў аўтамабіль міліцыі, куды яго "ветліва" запрашалі міліцыянты.





Зранку 16 жніўня Алесь Мех здымаў пабоі ў паліклініцы. Перад пачаткам суда Мех азнаёміўся з матэрыяламі справы.

У сваіх тлумачэннях суду Мех распавёў, што дапамагаў свайму знаёмаму рамантаваць замок. Знаёмы Дзіма Чарніцкі, паведаміў, што апроч замка разеткі іскраць. У адной з разетак яны пабачылі нейкія прылады, "праслушка". Хацелі сказаць маці Чарніцкага і вырашылі пакінуць кватэру. На сходах на іх напалі. Людзі ў масках скруцілі іх, паклалі і пачалі біць, наклалі кайданкі, Хтосьці з нападнікаў сказаў: " Ты што робіш, галаву праломіш..." мяне кінулі ў машыну. Там ужо быў Чарніцкі. Я проста не меў магчымасці аказаць супраціў. У РАЎС маю галаву накрылі коўдрай і тварам уніз я некалькі гадзін ляжаў пад коўдрай. Потым мяне вазілі ў наркалогію, мне рабілі ЭКГ".

У якасці сведкі выступіла **маці Чарніцкага:**

> *"15 жніўня каля 10 гадзін я праязджала побач з домам, дзе жыве мой сын і ўбачыла супрацоўнікаў міліцыі. Вырашыла зайсці ў кватэру, але мяне не пусціў Карповіч, міліцыянт. Ягоны начальнік Сурма паабяцаў, што ўсё вырашыцца. Калі заходзіла ў пад' езд – пабачыла кроплі крыві. У кватэры была калюжа, ішоў ператрус. Ператрус на кватэры праводзіўся з 13-40 да 14-35".*

У судзе быў дапытаны і Дзмітрый Чарніцкі.

> *"15 жніўня а 9-30 ў пад'ездзе дома на нас напалі людзі ў масках. З крыкамі "Рукі за галаву, ляжаць!" нас паклалі долу. На нашыя пытанні адказ быў адзін – «Мордай у падлогу!» Ніякіх пытанняў ці патрабаванняў да нас не прад'яўлялі і не задавалі. Вывалаклі і запхалі ў машыну".*


Сведка, супрацоўнік міліцыі **Ігар Карповіч**, патлумачыў наступнае:


"Адпаведна з пастановай пракурора, мы выдвінуліся для правядзення пратрусу. Пабачылі - двое спускаюцца па лесвіцы. Я прадставіўся і папрасіў падняцца назад, Чарніцкі адмовіўся, паспрабаваў мяне абмінуць, таму прымянілі сілу і кайданкі. Другі стаў чыніць перашкоду, супрацоўнікі АМАП прымянілі сілу і кайданкі. Калі вялі да аўтамабіля, Мех не хацеў ісці, упіраўся нагамі - чыніў непадпарадкаванне. Пастанову на пратрус я не паказваў, паказваў пасведчанне. Пастанова была са мной. Я не паказаў".


Як паведаміў праваабаронца **Уладзімір Вялічкін**, пасля выступу сведкі -супрацоўніка міліцыі суддзя Суддзя Кобрынскага раённага суду Ала Багнат прыняла рашэнне спыніць справу за недаказанасцю віны Аляксандра Меха.

Твитнуть










"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА




"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел Сапелка — на канферэнцыі АБСЕ

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK


















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY